связанных с развлечениями, завязыванием знакомств и нужных связей, приятными встречами, свиданиями, флиртом и т.п. С другой стороны, бал – это место тайных интриг и «сведения счетов», нередко заканчивающихся публичными скандалами и ссорами, а иногда и трагедиями. Именно амбивалентная специфика бала позволяет композиторам двояко трактовать бальные сцены, одновременно заключающие в себе противоположные образно-эмоциональные сферы – жизни и смерти, веселья и трагедии. Следствием этого стала как внутренняя драматургия картин бала, в основе которых довольно часто лежит принцип шекспировского контраста, так и их особая роль в общей оперной концепции, связанная с приданием бальным сценам функции важных, «узловых», нередко кульминационных зон произведения.

Подводя итог, хотелось бы подчеркнуть, что предложенный в настоящей статье подход к изучению проблемы художественной реконструкции бальной практики России XIX ст. в дальнейшем возможно апробировать и на ином музыкальном материале (например, на произведениях балетного жанра). Исследование специфики воплощения в творчестве русских композиторов романтической эпохи темы бала позволило не только в новом ракурсе осветить общий историко-культурный процесс, получить достаточно детально прописанную панораму бальной практики России обозначенного исторического периода, но и выявить ее музыкальную топику, раскрыть механизм ее художественного воплощения.

---

1. Короткова, М. В. Бальная культура московского дворянства в XVIII – первой половине XIX в.: официальное развлечение, церемония или любовная игра? / М. В. Короткова // Вестник РУДН Московского гос. пед. ун-та: сб. науч. ст. – М., 2008. – № 2. – С. 5.

2. Лирикон : сборник русской поэзии [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://liricon.ru/ – Дата доступа : 20.10.2016.

3. Гадецька, Г. М. Бальні танці як явище культури романтизму в творчій біографії М. І. Глінки / Г. М. Гадецька // Автореферат дис. … канд. мистецтвознавства: 17.00.01 – Теорія та історія культури. – Київ : НМАУ ім. П. І. Чайковського, 2013. – 17 с.

## МЕДЫЯТЭХНАЛОГІІ – СУЧАСНЫЯ МАСТАЦКІЯ СРОДКІ СЦЭНАГРАФІІ ДЗІЦЯЧАГА ЛЯЛЕЧНАГА СПЕКТАКЛЯ

**Жыдовіч У. Я.**
*аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*

***Анатацыя.*** *Артыкул прысвечаны аналізу вынікаў анкетнага апытання аўдыторыі дзіцячага спектакля з выкарыстаннем новых сродкаў сцэнічнай выразнасці, створаных з дапамогай медыятэхналогій. Высветлена, што медыятэхналогіі ў спектаклі служаць для стварэння відовішчнасці пастаноўкі і прадстаўляюць новы мультымедыйны тып сцэнаграфічнай выразнасці ў лялечным тэатры, які станоўча ўспрымаецца дарослай і дзіцячай аўдыторыяй.*

***Summary****. The article is devoted to analysis of the results of a questionnaire survey of the audience of children's performance. The author explores new means of stage expression in the puppet theater, created with the help of media technologies, and reveals, that media technologies in the play serve to create entertainment productions and present a new multimedia type of stage*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*design expressiveness in the puppet theater, which is positively perceived by the adult and child audience.*

Сёння ў Рэспубліцы Беларусь існуе 7 дзяржаўных прафесійных калектываў тэатраў лялек, якія мэтанакіравана займаюцца эстэтычным выхаваннем маленькага гледача і далучаюць дзяцей да тэатральнага мастацтва. З улікам прыросту насельніцтва, які назіраецца ў апошні час ў краіне, мастацтва тэатра лялек павінна быць запатрабаваным у гледача (бацькоў і дзяцей). Таму існуе неабходнасць пастаяннага вывучэння культурных запытаў і асаблівасцей успрымання спектакля наведвальнікамі тэатра лялек.

Маніторынг адносінаў гледачоў да спектакля як твора тэатральнага мастацва ляжыць не зусім у плоскасці даследаванняў кампаратыўнага мастацтвазнаўства, а больш датычыцца сферы сацыялогіі тэатра, але як лічыць доктар мастацтвазнаўства Р.Л. Бузук, аналізуючы механізмы ацэнкі спектакля гледачом, можна выявіць спецыфіку сацыяльна-мастацкага ўспрымання пастаноўкі публікай, «вызначыць структурныя характарыстыкі знакавых сістэм тэатра, а таксама асаблівасці функцыянавання алфавіту тэатральнай мовы» [1, с. 4]. Сацыялагічны ракурс даследавання даволі не часта выкарыстоўваецца ў карпаратыўным мастацтвазнаўстве і яшчэ больш рэдка ўжываецца пры аналізе пастановак тэатра лялек, што абумоўлівае навізну і актуальнасць зместу публікацыі. Артыкул прысвечаны аналізу вынікаў анкетнага апытання аўдыторыі дзіцячага спектакля з выкарыстаннем, запатрабаваных у сучаснага гледача, новых сродкаў сцэнічнай выразнасці – медыятэхналогій.

Мэта артыкула – *выявіць прызначэнне медыятэхналогій, як новага мастацкага сродка ў стварэнні візуальнага вобраза дзіцячага лялечнага спектакля.* Пры інтэрпрэтацыі вынікаў анкетнага апытання мы абапіраліся на прынцып каштоўнаснасці (*аксіялагічнасці*), які дазволіў адлюстраваць значнасць і праблематыку ўжывання мэдыятэхналогій у жыцці грамадства і іх уплыў на тэатральна-пастановачны працэс.

Візуальны вобраз спектакля даследчыкі ўпершую чаргу разглядаюць як мастацтва сцэнаграфічнага вырашэння пастаноўкі, якое лічыцца важным формаўтваральным і сэнсаўтваральным элементам пастаноўкі. Асаблівасцю вывучэння мастацтва сцэнаграфіі ў беларускім мастацтвазнаўстве з’яўляўся разгляд яго ў рамках агульнага тэарэтычнага мастацтвазнаўства айчыннымі даследчыкамі (Г. Барышаў, Т. Гаробчанка, П. Карнач, Т. Катовіч, В. Няфёд, Р. Смольскі, А. Сабалеўскі, В. Ярмалінская, С. Крывашэева, К. Дуброўская). Сярод прац, прысвечаных разгляду мастацтва сцэнаграфіі сучаснай Беларусі (Т. Катовіч, А. Савіцкая, В. Ярмалінская, С. Крывашэева), вылучаецца маштабнае комплекснае даследаванне сцэнаграфіі С. Крывашэевай, якая вызначыла тыпалогію сцэнаграфіі драматычных тэатраў Беларусі, якую можна выкарыстаць пры аналізе арганізаці сцэнічнай прасторы тэатра лялек. Пытанні сцэнаграфіі тэатра лялек, закранаюцца В. Ярмалінскай, Г. Алісейчык, але выкарыстанне *медыятэхналогій* у аганізацыі прасторы лялечнай сцэны яшчэ не мае грунтоўнага асэнсавання ў працах даследчыкаў.

У даследаванні сцэнаграфічнага мастацтва не існуе адзінага агульнапрынятага тэарэтычнага падыходу. У якасці найболей абгрунтаваных можна вылучыць: падыход да сцэнаграфіі спектакля як часткі агульнага гісторыка-культурнага працэсу; як да вызначанага этапу ў развіцці мастацкага афармлення спектакля; разгляд сцэнаграфіі як прасторавага рашэння спектакля; падыход да сцэнаграфіі як візуальнаму



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўвасабленню драматургічнай асновы спектакля. Апошні падыход, цесна звязаны з неаксіялагічнай трактоўкай (згодна В. Салееву), якая грунтуецца на стварэнні тэатрам каштоўнасцяў, іх засваенні і ацэньванні [3, с. 154]. Таму была зроблена спроба разгледзець медыятэхналогіі, як мастацікія сродкі стварэння візуальнага вобраза спектакля ў аксіялагічным полі.

Функцыянальная роля тэатральнай дэкарацыі ў лялечным спектаклі выяўляецца ў дзвюх формах: форме, калі дэкарацыя мадэлюе (можа адлюстроўваць, узнаўляць) і камунікатыўнай форме (якая ўздейнічае на гледача). *Мадэлюючая* функцыя медыятэхналогій характарызуе сучасныя мастацкія сродкі сцэнаграфіі, якія ствараюць *тэатральнасць*. *Камунікатыўная* функцыя медыятэхналогій як дэкарацыйнага фону характарызуе здольнасць адпаведнай выявай арганізоўваць сам *працэс успрымання*, гэта значыць ажыццявіць псіхалагічны ўвод у дзеянне, далучыць гледача да пэўнай мастацкай рэальнасці, стварыць усталёўку на наступленне і разгортванне падзей і драматургічных калізій.

«Мэдыятэхналогіі разумеюць у вузкім сэнсе як сродкі інфармацыйнай дзейнасці, а ў шырокім сэнсе мэдыятэхналогіі могуць быць зразумелы як тэхналогіі сацыяльнай дзейнасці, якія фарміруюць медыякультуру людзей» [2, с. 12]. Бо глабальная медыяпрастора ўздзейнічае на тэатр, медыясяроддзе фарміруе глядацкае ўспрыманне, медыяпрацэсы ўтвараюць высновы медыяграмадства, у якім прысутнічае новая сістэма каштоўнасцяў, якая сфарміравана медыятехналогіямі і інш.

Успрыманне спектакля – гэта вынік усталявання зваротнай сувязі яго творцаў з гледачамі. Каб выявіць асаблівасці ўспрымання гледачом спектакля лялечнага тэатра было праведзена анкетнае апытанне (для бацькоў і дзяцей) аудыторыі (472 чалавека) дзіцячага спектакля «Марозка» – вядомай рускай казкі, пастаўленай у Беларускім дзяржаўным тэатры лялек (Мінск) ў 2008 годзе (аўтар п'есы М. Шурынава, рэж. А. Жугжда, маст. В. Рачкоўскі), які прадаўжае быць папулярным у наведвальнікаў, асабліва ў час навагодніх святаў (мал. 1). Менавіта ў першыя дні новага года (перыяд аншлагу ў тэатры) і было праведзена апытанне.




*Крыніца:* дадзеныя сацыялагічнага даследавання 2015 г.
Мал. 1. Узрост дзяцей, якія прысутнічалі на спектакле «Марозка» (4 спектакля)

Зразумела ў анкеце было адно з самых папулярных пытанняў, якое задаюць у тэатры «Ці спадабаўся вам спектакль?» (Пытанне было адрасавана як бацькам, так і дзецям.) На гэта пытанне пераважная большасць апытаных адказала «Вельмі спадабаўся» ці «Спадабаўся». Дзеці (рознага ўзросту ад 2,6 да 18 гадоў) (мал. 1)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часцей за бацькоў выбіралі «Вельмі спадабаўся» і іх меркаванне далека не заўседы супадала з бацькоўскім (мал. 2).




*Крыніца:* дадзеныя сацыялагічнага даследавання 2015 г.
Мал. 2. Ацэнка спектакля «Марозка» гледачамі

Магчыма ў лялечным тэатры вельмі ўдзячны глядач, бо зусім ніхто за два дні прагляду (чатыры спектакля) не азначыў, што спектакль не спадабаўся. У сваіх каментарыях да адказаў гледачы звярталі ўвагу на відовішчнасць пастаноўкі, святочную атмасферу на сцэне, запамінальнасць сцэнаграфіі. Падаецца, што гэта абсалютна аб'ектыўны вынік і заслуга стваральнікаў пастаноўкі. Удакладняючая пытанні, якія павінны былі падпіхнуць гледача для больш дэталёвага аналізу спектакля (што канкрэтна больш падабалася) паказалі: што высокімі баламі (прапаноўвалася ад 1 да 5) большасць аўдыторыі адзначыла лялькі, ігру акцёраў, дэкарацыі, спецэфекты/светавое і візуальнае афармленне, музычнае афармленне. Шмат гледачоў паставілі па ўсім пазіцыям 5 балаў.

Неабходна, аднак, адзначыць, што чатыры балы атрымалі ад некаторых дарослых гледачоў сюжэт казкі, дэкарацыі і спецэфекты/светавое і візуальнае афармленне. Здаецца на гэта можна было не звярнуць увагу, але задачай даследавання было максімальна дакладна выявіць ацэнку якасці выразных магчымасцяў медыятэхналогій у дзіцячым спектаклі і ступень уздзеяння на маленькіх гледачоў і іх бацькоў (ці дарослых, з якімі дзеці наведалі театр). Бо «паўнавартаснае тэатральнае ўспрыманне мяркуе не толькі разумна-крытычнае стаўленне гледача да адбывалага, але і абавязковае яго духоўна-эмацыйнае ўдасканаленне» [4, с. 42].

Стваральнікі спектакля, у першую чаргу рэжысер і мастак, вельмі тонка адлюстравалі атмасферу зімы, казачнасці і навагодняга свята пры дапамозе светавых і мультымедыйных эфектаў. Карункі падобныя да сняжынак і сняжынкі, як карункі, з самага першага погляду звяртаюць на сябе ўвагу ў дэкарацыйным афармленні сцэны. Гледачы таксама найбольш часта адзначалі, што пасля прагляду спектакля ў іх памяці засталіся карункі, сняжынкі і, вядома, на першым месцы – Дзед Марозка. Выбар адказаў «Дзед Мароз» і «Сняжынкі» пацвярджае ўплыў на эмацыйна-ацэнкавае ўспрыманне гледача і яго доўгачасовую памяць сучасных *медыятэхналогій*, з дапамогай якіх створаны гэтыя выявы (праекцыя і анімацыя героя). У творчым аспекце медыятэхналогіі з'яўляюцца сёння важным састаўным элементам мастацка-пастановачнага вырашэння спектакляў, элементам тэатральнага спектакля, які вабіць дзяцей і ўплывае на іх рэфлексію, гэта значыць на тое, як яны будуць успамінаць спектакль пасля прагляду і перадаваць свае ўражанні ў аповядах, малюнках і інш.

З 2010 года на сцэнах беларускіх лялечных тэатраў пачалася эра актыўнага выкарыстання мультымедыйных тэхналогій у мастацкім афармленні пастановак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спектакль «Марозка», створаны ў 2008 годзе таксама быў адным з першых, дзе рэжысер А. Жугжда і яго каманда спецыялістаў па візуальнай графіцы (В. Стрыгельская, А. Торбік, Д. Жугжда), выкарысталі камп'ютарную анімацыю, якая не проста ўпрыгожыла дзеянне як спецэфект, а стварыла сапраўдную атмасферу казачных пераўтварэнняў: Дзед Марозка (жывы акцёр) час ад часу пераўтвараецца ў камп'ютарнага персанажа – яго праекцыя з'яўляецца на вялікім празрыстым экране-занавесе, які знаходзіцца перад сцэнай. Дзеці з захапленнем рэагуюць на вынаходніцтва рэжысёра, але відаць за сем гадоў з моманту стварэння спектакля візуальная культура дарослага гледача значна пашырылася, бо пераважна бацькі былі больш крытычнымі і ацанілі спецэфекты ў пастаноўцы на чатыры балы.

Медыятэхналогіі ў сучасным тэатры вызначаюць як *мультымедыйны тып сцэнічнай выразнасці* і адносяць да іх на тэатральнай сцэне мультымедыйныя праекцыі на экранах рознай велічыні, відэатрансляцыю, камп'ютерную анімацыю, 3-D мэппінг. Як тэхнічна-вытворчая і рэжысерска-пастановачная дзейнасць медыятэхналогіі становяцца тым інавацыйным фактарам, які дазваляе па-новаму зірнуць на традыцыйныя падыходы для рашэння надзённых мастацка-пастановачных праблем лялечных спектакляў. Перавагі сучасных мэдыятэхналогій складаюцца ў тым, што яны могуць аб'яднаць шматстатнасць існуючых моў у прадстаўленні, уключаючы мову жэстава-кінэтычную, мову-выяў і натуральную мову, адлюстроўваючы шматмернасць і шматмадэльнасць чалавечых ведаў.

Сярод функцый мэдыятэхналогій у дачыненні да сцэнічнай дзейнасці можна вылучыць пераўтваральную, каштоўнасна-арыентацыйную, экспрэсіўную і пазнавальную. Дзякуючы навукова-сацыяльнай навізне мэдыятэхналогій іх вытворчая дастасавальнасць у тэатры з кожным годам павялічваецца, і яны становяцца комплексным сродкам засваення чалавекам (як пастаноўшчыкамі, так і гледачамі) навакольнага свету ў яго сацыяльных, маральных, мастацкіх і псіхалагічных аспектах. Узаемадзеянне мэдыятэхналогій і тэатральнай дзейнасці носіць дыялектычны характар: з аднаго боку, гэтыя тэхналогіі ў тэатры ўплываюць на гледача, з іншага боку, яны з'яўляюцца, каб задаволіць запатрабаванні глядацкай аўдыторыі.

Сучасныя пастаноўкі сёння часта з'яўляюцца рэбусам для гледача з-за шматузроўневай структуры прадстаўленых тэкстаў. Інфармацыя, якой валодае глядач яшчэ да прагляду спектакля (візуальныя вобразы (тэксты) кінастужак, раней убачаных пастановак, кантэнту вакол пастаноўкі – рэпартажы, інтэрв'ю рэжысёра, меркаванне крытыкаў і інш.), дапамагаюць разгадаць сэнс пастаноўкі на сцэне, прачытаць спасылкі да ранейшага мэдыякантэнту.

Таму ў анкеце былі пытанні, якія мелі сувязь з падрыхтоўкай маленькага гледача да прагляду спектакля – пытанне пра знаёмства з казкай «Марозка» (Ці чыталі вы казку «Марозка»?), пра прагляд фільма ці мультфільма «Марозка» (Ці бачылі мастацкі фільм «Марозка»? і Ці глядзелі вы мультфільм «Марозка»?) Пытанні мелі мэту высвятліць як уплываюць экранныя (медыйныя) вобразы на сацыяльна-мастацкае ўспрыманне спектакля публікай. Нечакана высветлілася (магчыма і для саміх бацькоў), што казку «Марозка», якая добра вядома бацькам яшчэ з дзяцінства, бацькі не чыталі раней *сваім* дзецям! Магчыма сапраўды ў новых дзяцей новыя казкі, дзе героі толькі сімпсаны, трансформеры, ці ў лепшым выпадку расійскія смяшарыкі? Альбо бацькі перасталі чытаць казкі дзецям і іх выхоўваюць тэлевізары і планшэты? На пытанне «Ці глядзелі вы мультфільм «Марозка?» і «Ці бачылі мастацкі фільм «Марозка»? (дарослыя гледачы ўспомнілі класіку савецкага кінематографа – мастацкі фільм «Марозка» (1964), рэж. А. Роў) – сцвярджаючых адказаў ад дзяцей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школьнага ўзросту было крыху больш, але таксама вельмі мала…

Так паўстае трывожнае і хвалюючае пытанне: «А як жа сёння здзяйсняецца сувязь пакаленняў?». Застаецца спадзявацца, што тэатр лялек можа быць тым важным звяном, якое злучыць пакаленні.

Безумоўна, гэта права і жаданне рэжысёра ставіць ці не перад спектаклем такую задачу і ўводзіць (адсылаць да медыявобразаў) ці не вядомыя экранныя вобразы ў кантэкст пастаноўкі, каб забяспечыць трансляцыю візуальных кодаў. Важна другое – звярнуць увагу пастаноўшчыкаў на тое, што ў лялечным тэатры, які сёння відазмяняецца разам са зменай пакаленняў, тэхнікі і тэхналогій, запытамі часу і гледача, мэдыятэхналогіі побач з лялькамі і акцёрамі ўяўляюць не толькі тэхнічныя і пастановачныя навіны, але і таксама адмысловы *спосаб транслявання* мастацкіх, эстэтычных і агульначалавечых каштоўнасцяў паміж пакаленнямі.

Зразумела, што нельга экстрапаліраваць вынікі аднаго апытання на корпус усіх дзіцячых спектакляў у тэатры лялек, але *наватарскі характар* сцэнаграфіі, як і *праблемы мастацка-вобразнага вырашэння,* часам вызначаюцца нават у адным эпізоде пастаноўкі.

На наш погляд, відавочна (і гэта дэманструюць дадзеныя апытання – адназначнасць меркавання – спадабалася і вельмі спадабалася (іншых меркаванняў не выяўлена) аднадушнае прызнанне гледачом, што медыятэхналогіі маюць высокі патэнцыял стварэння *тэатральнасці пастановак у лялечным тэатры* і рэпрэзентацыі вядомай казкі з дапамогай новай візуальнай мовы сучаснага тэатра. У адпаведнасці з класіфікацыяй сучасных мастацкіх сродкаў арганізацыі сцэнічнай прасторы медыятэхналогіі ў спектаклі служаць для стварэння *відовішчнасці* пастаноўкі і прадстаўляюць *новы мультымедыйны тып сцэнаграфічнай выразнасці* ў лялечным тэатры. Даследаванне паказала, што гэты тып сцэнаграфіі станоўча ўспрымаецца дарослай і дзіцячай аўдыторыяй.

Такім чынам, сацыялагічнае даследаванне (апытанне) успрымання мастацтва тэатра лялек дазволіла разгледзець *мэдыятэхналогіі як самадастатковую мастацкую з'яву*, якая станоўча ўплывае на сацыяльна-мастацкае ўспрыманне тэатральнай аўдыторыі рознага ўзросту.

Тэхналагічны ўзровень медыятэхналогій на сцэне павінен адпавядаць узроўню медыякультуры гледача (яшчэ лепш – уражваць самымі перадавымі тэхналогіямі). Вынікі даследавання адлюстроўваюць значнасць і праблематыку ўжывання мэдыятэхналогій у тэатральна-пастановачным працэсе: недастаткова ўлічваюцца постаноўшчыкамі магчымасці медыятэхналогій да рэпрэзентацыі медыявобразаў вечных каштоўнасцяў на сцэне (у аксіялагічным вымярэнні сцэнаграфіі).

Феномен медыятэхналогій у мастацтве тэатра лялек патрабуе вывучэння *прадуктыўнасці ўспрымання* спектакля гледачом. Прызначэнне медыятэхналогій, як новага мастацкага сродка ў стварэнні візуальнага вобраза дзіцячага лялечнага спектакля, быць *новай тэатральнай мовай*, здольнай ствараць *тэатральнасць* сцэнічнай пастаноўкі і захоўваць *сувязь* пакаленняў.

---


1. Бузук, Р. Л. Некоторые закономерности восприятия сценического искусства / Р. Л. Бузук // Вести института современных знаний. – 2016. – № 2 (67). – С. 3–8.

2. Константинова, А. П. Философские проблемы медиатехнологий: автореф. … дис. канд. филос. наук: 09.00.08 / А. П. Константинова ; Рос. гос. пед. ун-т им. А.И. Герцена. – Санкт-Петербург, 2011. – С. 11.

3. Салееў, В. А. Нарысы тэорыі беларусскага тэатра / В. А. Салееў. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 172 с.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Юдчиц, Г. В. Театральное пространство. Теория и практика / Г. В. Юдчиц. – Минск : Право и экономика, 2007. – 220 с.

# ОСОБЕННОСТИ СИСТЕМООБРАЗОВАНИЯ АНТИКВАРНОГО АРТ-РЫНКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

**Казанина В. Ю.**
*магистр искусствоведения, аспирант кафедры белорусской и мировой художественной культуры Белорусского государственного университета культуры и искусств (г. Минск)*

***Аннотация.*** *В статье приводится теоретический анализ становления отечественного арт-рынка. Выявлены факторы, определяющие направления развития антикварного рынка на современном этапе, представлены ключевые тенденции развития антикварного рынка в Республике Беларусь.*

***Summary.*** *The article provides a theoretical analysis of the formation of the art market. The factors of the antiquarian market development at the present stage are revealed. The key tendencies of the antiquarian market formation in the Republic of Belarus are related.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Современные и относительно новые для Беларуси процессы формирования отечественной индустрии культуры обусловили особую актуальность исследования системообразования арт-рынка вообще, и антикварного арт-рынка в частности, а также – оценки взаимовлияния между вышеназванными процессами и социокультурной жизнью общества. Под системообразованием антикварного арт-рынка мы имеем в виду *становление его структуры* и *формирование ключевых тенденций*. Необходимость проведения комплексного исследования системообразования отечественного антикварного арт-рынка обусловлено его значением для таких явлений, как этнокультурная идентичность, национальное искусство, национальный художественный стиль и т.д. Это исследование не может быть проведено дискретно (в рамках одной научной дисциплины) и требует совместных усилий в рамках искусствоведения, культурологии, истории, социологии, экономической теории, фактически, – компаративно-междисциплинарного подхода.

Уровень прикладного, «сиюминутного» интереса к антикварному арт-рынку Республики Беларусь пока превалирует над серьезной теоретической разработанностью этого вопроса в современной гуманитаристике. В этой связи внимание аналитиков ограничено изучением морфологии, структуры антикварного рынка (арт-бизнеса, субъектов антикварного рынка и их взаимоотношений). Недостаточно исследована его процессуальная сторона и превалирующие тенденции: законодательные основы регулирования антикварного рынка, экспертно-оценочная деятельность, новые формы менеджмента и маркетинга. Таким образом, теоретико-методологические аспекты изучения системообразования антикварного арт-рынка (как специфического культурного явления, влияющего на создание, использование, оборот и видоизменение предметов антиквариата) являются сегодня актуальными в теоретическом и в практическом смысле.

Целью исследования является анализ тенденций развития антикварного арт-рынка Республики Беларусь на основе сопоставления важности ключевых факторов влияния на трансформацию анализируемого рынка с учетом уже действующих моделей создания и потребления антикварных вещей. Достижение данной цели